**УДК 168.522:331.108.2**

# ГІСТАРЫЧНЫЯ ВЕХІ СТАНАЎЛЕННЯ КАДРАВАЙ СІСТЭМЫ КУЛЬТУРЫ

***А.І. СЦЕПАНЦОЎ***
***(Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў, Мінск)***

*Разглядаецца гістарычная дынаміка фарміравання цэласнай кадравай сістэмы галіны культуры, якая прайшла пэўныя этапы развіцця. Прапанавана яе перыядызацыя: 1) стварэнне інстытуцыянальнай культурна-асветнай сістэмы і ў яе межах развіццё кадравай складаючай; 2) інтэнсіўнае адраджэнне (пасля ўрону, нанесенага Вялікай Айчыннай вайной) і ўдасканаленне культурна-асветнай сістэмы, прафесійнага мастацтва і мастацкай адукацыі, узмацненне кадравага патэнцыялу галіны культуры; 3) набліжэнне да фарміравання цэласнай кадравай сістэмы, імкненне да інтэграцыі ўзаемна звязаных узроўняў адукацыі ў адзіную сістэму бесперапыннай прафесійнай адукацыі ў сферы культуры; 4) усталяванне кадравай сістэмы галіны культуры як сукупнасці ўзаемазвязаных падсістэм: прафесійнай мастацка-вытворчай дзейнасці; бесперапыннай прафесійнай адукацыі; кіраўнічай падсістэмы, якая арганізуе і каардынуе дзейнасць усёй сукупнай кадравай сістэмы. Адзначаецца, што кадры з'яўляюцца галоўнай прадукцыйнай сілай культурнага працэсу, яны забяспечваюць выніковасць, эфектыўнасць дзейнасці і вырашэнне праблем культурнага развіцця.*

**Уводзіны.** Вывучэнне кадраў культуры ў гістарычнай дынаміцы мае ключавое значэнне пры распрацоўцы шляхоў і метадаў арганізацыі сацыякультурнай дзейнасці. Кадравы склад сферы культуры ўносіць значны ўклад у сацыяльны прагрэс краіны, задавальняе ўсе асноўныя мастацка-культурныя запатрабаванні грамадства. Кадры ажыццяўляюць сацыякультурную дзейнасць у культурна-асветных і тэатральна-відовішчных арганізацыях культуры: тэатрах і філармоніях, музеях, бібліятэках, клубах і дамах культуры, цэнтрах народнай творчасці, рамёстваў, фальклору, народных традыцый, школах народнай творчасці, этнаграфічных кутках, дзіцячых школах мастацтваў, сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных установах культуры. Ацэнка рэтраспектывы развіцця і станаўлення кадравай сістэмы дазваляе вызначыць з агульнай плыні культурнага працэсу значэнне кожнага з выдзеленых перыядаў і выпрацаваць прагноз далейшага руху як сістэмы ў цэлым, так і яе асобных элементаў.

**Асноўная частка.** Гісторыя мастацкай адукацыі Беларусі пачынаецца з адкрыцця Віцебскай народнай кансерваторыі па дазволу Наркамасветы РСФСР ад 18 чэрвеня 1918 года [1]. Праз год кансерваторыя была рэфармавана ў спецыяльную музычную школу 3-х ступеняў: ад пачатковай да прафесійнай з правам выкладання ў музычнай школе першай ступені, з 1922 года – гэта музычны тэхнікум з выканальніцкім, навукова-тэарэтычным і інструктарска-педагагічным аддзеламі. У 1924 годзе быў заснаваны Мінскі музычны тэхнікум з класамі музычных інструментаў, кампазіцыі, вакалу, інструктарскім аддзяленнем, якое рыхтавала настаўнікаў музыкі для агульнаадукацыйных школ, дзіцячых дамоў, дзіцячых садкоў, кіраўнікоў мастацкай самадзейнасці (з 1935 г. – аддзяленне музычнага выхавання). З 1928 года пачалася падрыхтоўка кадраў культуры ў Магілёўскім палітасветтэхнікуме, з 1939 года – гэта палітшкола, якая рыхтавала селькораў, работнікаў хат-чытальняў, настаўнікаў грамадазнаўства, у далейшым (з 1944 г.) – культурна-асветнае вучылішча, потым (з 1990 г.) – вучылішча культуры са спецыялізацыямі: дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, харэаграфічнае і тэатральнае мастацтва, інструментальная і харавая музыка, рэжысура святаў і абрадаў, кінафотавідэааматарства. У 1937 годзе адкрылася музычнае вучылішча ў Магілёве, у 1939 годзе – у Брэсце. Тэатральная адукацыя бярэ пачатак з 1919 года, з адкрыцця ў Гомелі Народна-пралетарскай музычна-драматычнай студыі. Праз два гады ў Мінску была створана Хатка беларускага мастацтва, сярод задач якой была таксама і падрыхтоўка кадраў тэатральнага мастацтва, у 1921 годзе – Беларуская драматычная студыя ў Маскве, у якой беларускім навучэнцам выкладалі майстры тэатральнага мастацтва з МХАТа, у 1931 годзе – аднагадовыя драматычныя курсы і тэхнікум сцэнічнага мастацтва ў Мінску, праз год – Беларуская тэатральная студыя пры Цэнтральным тэатральным вучылішчы ў Ленінградзе [2].

Масавы выпуск спецыялістаў у кароткі тэрмін умацаваў прафесійныя мастацкія калектывы, павялічыў колькасць прафесіяналаў-выкладчыкаў мастацтва ў школах, дазволіў удасканаліць сістэму культурна-асветнай работы ў рэспубліцы. Чатырнаццаць гадоў існавання сярэдняй спецыяльнай адукацыі прывялі да стварэння ў 1932 годзе першай вышэйшай навучальнай установы – Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі з навучаннем па спецыяльнасцях фартэпіяна, спевы, струнныя і духавыя інструменты, кампазіцыя, дырыжыраванне. Адкрыліся аддзяленні клубна-інструктарскага і дзіцячага музычнага выхавання (рыхтавала кіраўнікоў музычнага выхавання, выкладчыкаў музычных тэхнікумаў), а праз сем гадоў – аддзяленне народных інструментаў. Пры кансерваторыі існавалі музычныя курсы па павышэнню кваліфікацыі ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці і падрыхтоўцы кіраўнікоў самадзейных музычных калектываў. Да пачатку вайны кансерваторыя дала пяць выпускаў выканальніцкіх спецыяльнасцей і два выпускі тэарэтыка-кампазітарскага факультэта [3].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, *у **1918 – 1940 гадах** у сацыякультурнай прасторы краіны ажыццяўлялася мэтанакіраванае культурнае будаўніцтва: стварэнне інстытуцыянальнай культурна-асветнай сістэмы, адначасова з разгортваннем прафесійнай мастацкай адукацыі як асновы дзяржаўнай кадравай сістэмы.*

***1944 – 1975 гады** – перыяд інтэнсіўнага адраджэння* (пасля ўрону, нанесенага Вялікай Айчыннай вайной) і *ўдасканалення культурна-асветнай сістэмы, прафесійнага мастацтва. Адначасова адраджалася і працягвала развівацца адукацыйная падсістэма культуры – крыніца папаўнення кадравых рэсурсаў культуры.* У 1945 годзе быў адкрыты Беларускі тэатральны інстытут, у 1953 годзе – мастацкі факультэт, установа атрымала назву «Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут». У 1975 годзе – створаны Мінскі інстытут культуры. Разам тры ВНУ забяспечвалі кадрамі вышэйшай кваліфікацыі ўсе тыпы арганізацый і ўстаноў культуры: тэатральна-відовішчныя, культурна-асветныя і навучальныя. У гэты перыяд наладжвалася і падрыхтоўка навукова-педагагічных кадраў: першая аспірантура была арганізавана ў Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце ў 1962 годзе па спецыяльнасці «рэжысура і майстэрства акцёра», у 1972 годзе – па спецыяльнасцях «мастацтвазнаўства» (тэатральнае мастацтва, выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і архітэктура). У 1967 годзе ў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі была адкрыта асістэнтура-стажыроўка па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў для педагагічнай работы ў ВНУ культуры і канцэртнай дзейнасці.

Развівалася сярэдняя спецыяльная адукацыя: былі адкрыты музычныя вучылішчы ў Гродна, Маладзечна, Наваполацку, Баранавічах, Лідзе, Мазыры. Ажыццяўлялася масавае адкрыццё дзіцячых музычных школ – пачатковых устаноў прафесійнай арыентацыі.

У гэты перыяд завершылася фарміраванне сістэмы кіравання галіной культуры: да Упраўлення па справах мастацтва пры Савеце Народных Камісараў БССР (існавала з 1940 г.) далучыўся створаны ў 1946 годзе Камітэт па справах культасветустаноў пры Савеце Міністраў, а ў 1953 годзе кіраўнічыя функцыі былі аб'яднаны ў адзіным Міністэрстве культуры ў складзе Савета Міністраў [4]. Былі разгорнуты таксама адпаведныя органы тэрытарыяльнага кіравання культурай.

***1976 – 1990 гады** – набліжэнне да фарміравання цэласнай кадравай сістэмы, імкненне да інтэграцыі ўзаемазвязаных узроўняў адукацыі ў адзіную сістэму бесперапыннай прафесійнай адукацыі ў галіне культуры.* Упершыню быў ажыццёўлены праграмна-мэтавы падыход да рашэння кадравых праблем: Міністэрства культуры Беларусі распрацавала «Галіновую праграму развіцця "Кадры" на перыяд да 1990 года» (зацверджана Пастановай калегіі ад 23 студзеня 1986 г.). Былі сфармуляваны арганізацыйныя практычныя меры, накіраваныя «на поўнае забеспячэнне ўстаноў культуры і мастацтва кваліфікаванымі спецыялістамі, стварэнне ўмоў іх ідэйна-палітычнага, прафесійнага росту і замацавання». Гэты праграмны дакумент Міністэрства культуры ў цэлым аказаў станоўчы ўплыў на кадравую стратэгію галіны, ён падштурхнуў усе ўзроўні кіравання ўстановамі культуры да планамернай работы па фарміраванні кадравага складу, здольнага сістэмна вырашаць праблемы культурнага развіцця.

Для развіцця кадравай сістэмы значным дакументам стаў прыняты ў канцы 1986 года «Комплексны план эстэтычнага выхавання насельніцтва рэспублікі да 2000 года», адзін з раздзелаў якога прадугледжваў забеспячэнне ўстаноў культуры і мастацтва кадрамі кваліфікаваных спецыялістаў праз мэтавую і пазаконкурсную формы навучання ў вядучых саюзных ВНУ. Прадугледжвалася таксама ўвядзенне новых спецыялізацый у Белдзяржкансерваторыі і музычных вучылішчах [5].

Умоўны адлік пачатку працэса фарміравання *адзінай сістэмы бесперапыннай прафесійнай адукацыі ў галіне культуры* правамерна звязаць з прыняццем Пастановы Саўміна БССР ад 5.08.88 № 266. Гэтым дакументам з сістэмы Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў падпарадкаванне Міністэрства культуры былі перададзены Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут, Мінскі інстытут культуры, Мінскае мастацкае вучылішча, Магілёўскае, Віцебскае, Гродзенскае, Мінскае культасветвучылішчы, Магілёўскі бібліятэчны тэхнікум. У гэты ж месяц Саўмін БССР прыняў пастанову «Аб генеральнай схеме кіравання Міністэрства культуры БССР», у якой зацвярджаліся асноўныя кірункі дзейнасці, падпарадкоўваліся непасрэдна міністэрству ўстановы былога Дзяржкіно, перадаваліся сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы, размешчаныя ў абласцях, у кіраванне ўпраўленняў культуры аблвыканкамаў [6]. Такім чынам, 3 вышэйшыя і 21 сярэдняя спецыяльная навучальныя ўстановы склалі адзіную прафесійную сістэму падрыхтоўкі кадраў культуры, якая адпавядала відаваму падзелу мастацкай культуры. Былі закладзены адзіныя арганізацыйна-метадычныя асновы для ўдасканалення ўсіх адукацыйных узроўняў сістэмы прафесійных навучальных устаноў культуры, паглыблення іх творчых сувязяў.

***Навейшы перыяд (1991 – 2005 гг.)** – звязаны з прыняццем Вярхоўным Саветам Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. Краіна набыла палітычную і эканамічную незалежнасць. Адбылося ўзмацненне і далейшае развіццё агульнадзяржаўных падыходаў да кадравага будаўніцтва, усталяванне кадравай сістэмы галіны культуры як сукупнасці ўзаемазвязаных падсістэм:* прафесійнай дзейнасці абагульненых суб'ектаў (непасрэдных стваральнікаў культурнага прадукта і арганізатараў культурнай вытворчасці), бесперапыннай прафесійнай адукацыі ў галіне культуры (падрыхтоўка і ўдасканаленне кадраў культуры).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Удасканальвалася структура і змест дзейнасці вышэйшых навучальных устаноў мастацтва. Гэтым змяненням сталі адпавядаць іх новыя назвы, зацверджаныя адпаведнымі пастановамі Саўміна Рэспублікі Беларусь [7]:

- у 1991 годзе – Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў (раней – тэатральна-мастацкі інстытут) з навучаннем па спецыяльнасцях: акцёрскае мастацва, рэжысура, тэатразнаўства, кінатэлеаператарства, жывапіс, графіка, скульптура, мастацтвазнаўства, манументальна-дэкаратыўнае мастацтва, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, дызайн, інтэр'ер і абсталяванне, праектаванне выставак і рэкламы, мастацкае праектаванне вырабаў тэкстыльнай і лёгкай прамысловасці;
- у 1992 годзе – Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі (раней – кансерваторыя) з навучаннем па ўсіх інструментах сімфанічнага аркестра, народным інструментам, фартэпіяна, дырыжыраванню, вакалу, тэорыі і гісторыі музыкі, з 1996 года таксама харэаграфія (класічны танец);
- у 1993 годзе – Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры (раней – Мінскі інстытут культуры), які меў да 1990 года толькі дзве спецыяльнасці, а ў першай палове 90-х гадоў навучанне вялося ўжо па 11 спецыяльнасцях – бібліятэказнаўства, народная творчасць, мастацтва эстрады, культуралогія, сацыяльная педагогіка, сацыяльная работа, літаратурная работа, музейная справа, харэаграфія (народны і бальны танец), дырыжыраванне, рэжысура (масавых мерапрыемстваў і святаў).

З 1995 года паступова ўзрастала паслядоўная арганізацыйная і фінансавая падтрымка дзяржавай сферы культуры. Другая палова дзевяностых гадоў – гэта час актыўных кіраўнічых дзеянняў па ўдасканаленні ўсіх напрамкаў культурнай дзейнасці. Мінкультуры Рэспублікі Беларусь (рашэнне калегіі ад 23 снежня 1997 года, № 11, п. 2) абвяшчае аб пераходзе «да поўнага кадравага самазабеспячэння галіны» і выпрацоўвае стратэгію далейшага развіцця мастацкай адукацыі, вызначае шляхі спецыялізацыі навучальных устаноў, развіцця спецыяльнасцей і спецыялізацый, фарміравання кантынгенту навучэнцаў і студэнтаў, выкладчыцкага складу, удасканалення навукова-метадычнага забеспячэння і сістэмы творчага стымулявання (конкурсы, фестывалі, агляды, выстаўкі, канферэнцыі, семінары); паляпшэнне матэрыяльна-тэхнічнага стану навучальных устаноў [8].

Сведчаннем увагі і падтрымкі дзяржавы стала праведзеная 31 студзеня – 1 лютага 2001 года Рэспубліканская нарада дзеячаў культуры і мастацтва «Аб мерах па вырашэнні праблем развіцця культуры і мастацтва». У дакладзе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнкі вызначана, што культура аказвае адмысловы ўплыў на станаўленне дзяржаўнасці, фарміруе спрыяльнае жыццёвае асяродзе нацыі. «Без апоры на высокую культуру мы не зможам выхаваць грамадзяніна-патрыёта, руплівага працаўніка, клапатлівага сем'яніна, асобу творчую і духоўна багатую. <...> Культурны патэнцыял – найважны паказчык міжнароднага аўтарытэту нашай дзяржавы». Акрэслена задача ўлады: «глыбокае і аб'ектыўнае веданне тэндэнцый, стварэнне аптымальных умоў для развіцця ўсіх відаў мастацтва і культуры з улікам рэальных магчымасцяў, якія маюцца ў дзяржавы і грамадства. Менавіта агульнадзяржаўны, а не вузкаведамасны падыход, дазваляе маштабна ацэньваць з'явы, бачыць вастрыню праблем, вызначаць найболей важныя кірункі дзейнасці». Сярод адзначаных пазітыўных тэндэнцый – захаванне і прымнажэнне сістэмы эстэтычнага выхавання дзяцей і юнацтва, сістэмы вышэйшай і сярэдняй мастацкай адукацыі [9, с. 11 – 15]. Гэты тэзіс атрымаў развіццё і ў выніках нарады: пратаколам даручэнняў па падтрымцы развіцця ўстаноў культуры, мастацкіх калектываў было прадугледжана ў тым ліку і павелічэнне прыёму ў вышэйшыя навучальныя ўстановы культуры і мастацтва [9, с. 114]. Павелічэнне мела мэтавы кірунак – задавальненне патрэбнасцяў рэгіёнаў у спецыялістах вышэйшай кваліфікацыі. Таму ў бліжэйшыя гады на базе абласных музычных вучылішчаў былі адкрыты філіялы кафедраў Акадэміі музыкі, і зараз функцыянуе адладжаная сістэма вышэйшай музычнай адукацыі, якая ахоплівае кожную вобласць.

Вырашальны ўплыў на выпрацоўку кадравай стратэгіі кожнага дзяржаўнага органа кіравання мела прынятая ў 2001 годзе Канцэпцыя дзяржаўнай кадравай палітыкі Рэспублікі Беларусь. Дакумент вызначыў асноўныя кірункі ў фарміраванні сучасных патрабаванняў да кадраў розных сфер дзейнасці і ўзроўняў упраўлення, удасканаленню формаў і метадаў іх ацэнкі; падбору і рацыянальнаму выкарыстанню кадраў з улікам іх прафесійных і маральна-псіхалагічных якасцей, матывацыі і стварэнню спрыяльных умоў для іх эфектыўнай працы і прафесійнай кар'еры; фарміраванню дзейснага рэзерву кіруючых кадраў, удасканаленню сістэмы падрыхтоўкі, перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі кадраў [10].

На падставе гэтага агульнадзяржаўнага дакумента Міністэрства культуры прыняло галіновую праграму «Кадры культуры – 2001 – 2005 гады» У пяці яе раздзелах прадугледжвалася стварэнне адпаведных методык па ўдасканаленню работы з кадрамі, распрацоўка кваліфікацыйных характарыстык спецыялістаў, удасканаленне механізма і пашырэнне практыкі дыягнаставання прафесійна-дзелавых і асабістых якасцей работнікаў пры іх атэстацыі, вылучэнне рэзерва на кіруючыя пасады, стварэнне банкаў даных кадравага патэнцыялу, сістэмы яго маніторынга; распрацоўка адукацыйных стандартаў для ССНУ і ВНУ культуры; распрацоўка прагнозу патрэбнасці ў перападрыхтоўцы і павышэнні кваліфікацыі кіруючых кадраў і спецыялістаў культуры; пашырэнне мэтавай падрыхтоўкі навукова-педагагічных кадраў у адпавед-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

насці з патрэбамі рэгіёнаў; стварэнне і папаўненне зводнага рэестру тэм навуковых даследаванняў (у тым ліку і дысертацыйных). У цэлым галіновая праграма паспрыяла ўдасканаленню сістэмы работы з кадрамі, укамплектаванню ўстаноў культуры высокакваліфікаванымі спецыялістамі, здольнымі ажыццяўляць сацыяльна-культурную палітыку дзяржавы.

**Вывады.** Сучасная кадравая сістэма сферы культуры ўсталявалася ў працэсе гістарычнага развіцця, які магчыма падзяліць на наступныя этапы:

1) арганізацыя культурна-асветніцкай работы як дзяржаўнай справы, стварэнне адпаведнай структуры культурных інстытутаў, у ліку якіх: прафесійна-адукацыйныя; развіццё кадравай складаючай (1918 – 1940 гг.);

2) разгортванне і ўдасканаленне прафесійнай мастацкай адукацыі як крыніцы папаўнення кадравых рэсурсаў мастацкай творчасці, культурна-дасугавай дзейнасці (1944 – 1975 гг.);

3) набліжэнне да фарміравання цэласнай кадравай сістэмы, імкненне да інтэграцыі ўзаемазвязаных узроўняў адукацыі ў адзіную падсістэму бесперапыннай прафесійнай адукацыі ў сферы культуры (1976 – 1990 гг.);

4) аб'яднанне ў цэласную кадравую сістэму галіны культуры як сукупнасці ўзаемазвязаных састаўляючых: прафесійнай мастацка-вытворчай дзейнасці абагульненых суб'ектаў; бесперапыннай прафесійнай адукацыі ў галіне культуры, здольнай поўнасцю забяспечваць патрэбнасці краіны спецыялістамі; кіраўнічай падсістэмы, якая арганізуе і каардынуе дзейнасць усёй сукупнай кадравай сістэмы (1991 – 2005 гг.).

Кадравая сістэма галіны культуры навейшага дзесяцігоддзя з'яўляецца крыніцай якасных зрухаў у развіцці культуры і адлюстроўвае змены ў змесце ўсёй сістэмы культуры, яна забяспечвае колькаснае і якаснае прырашчэнне кадравага патэнцыялу галіны. Характарыстыкі кадравага патэнцыялу складаюць веды і навыкі, кваліфікацыя і вытворчы досвед; адукацыя і прафесіяналізм, рознабаковае развіццё і крэатыўнасць, прадпрымальнасць і маральнасць, імкненне да наваўвядзенняў. Кадры як галоўная прадукцыйная сіла культурнага працэсу забяспечваюць выніковасць, эфектыўнасць дзейнасці і вырашэнне праблем культурнага развіцця.

Актуальнай застаецца неабходнасць працягу вызначэння заканамернасцей творчага станаўлення спецыялістаў культуры, вывучэння іх культурна-творчых характарыстык, зместу і вынікаў сацыяльна-культурнай дзейнасці, умацавання навуковых падыходаў, стварэння спрыяльных умоў для пастаяннага паглыблення кампетэнтнасці, узроўню прафесіяналізма. Патрабуецца далейшае ўдасканаленне структуры павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі спецыялістаў сферы культуры, актывізацыя распаўсюджвання іх вопыту арганізацыі і запаўнення сферы вольнага часу разнастайнымі відамі і формамі сацыяльна-культурнай дзейнасці.

## ЛІТАРАТУРА

1. Мастацтва Савецкай Беларусі: зб. дак. і матэрыялаў: у 2-х т. / Галоўнае архіўнае упраўленне СМ БССР; Ін-т гісторыі партыі пры ЦК КПБ; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР; рэдкал.: С.В. Марцалеў (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1976. – Т. 1 (1917 – 1941 гг.). – 415 с.
2. Марцелев, С.В. К духовному расцвету. Исторический опыт развития белорусской советской культуры / С.В. Марцелев. – Минск: Беларусь, 1974. – 408 с.
3. Масленікава, В.П. Музычная адукацыя ў Беларусі / В.П. Масленікава. – Мінск: Навука і тэхніка, 1980. – 112 с.
4. Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ). – Фонд 974. – Оп. 2. – Предисловие.
5. НАРБ. – Фонд 7.– Оп. 10. – Д. 991.
6. НАРБ. – Фонд 7. – Оп. 10. – Д. 108.
7. Постановления Совета Министров Республики Беларусь от 15.11.91, № 424; от 30.07.92, № 465; от 30.09.93, № 662 / Нац. Интернет-портал Респ. Беларусь [Электронный ресурс] / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2006. – Режим доступа: http://www.pravo.by. – Дата доступа: 18.02.2008.
8. Архив Министерства культуры Республики Беларусь. – Фонд 974. – Д. 149.
9. Национальная культура – важнейший стратегический ресурс Белорусского государства // О мерах по решению проблем развития культуры и искусства: материалы респ. совещ., Минск, 1 февр. 2001 г. / редкол.: В.П. Заметалин [и др.]. – Минск: Минск. ф-ка цв. печ., 2001. – 120 с.
10. Концепция государственной кадровой политики Республики Беларусь // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь, 2001. – № 68. – С. 9 – 14.

*Паступіў 24.03.2008*



РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ